**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за снежань 2023 г.

## Мерапрыемствы ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу

***1 снежня***

*На прафілактычны ўрок «ВИЧ-инфекция: пути передачи, меры защиты» запрошаны урач-эпідэміёлаг Кобрынскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі **Ірына Ператолчына**. Прадстаўлена відэапрэзентацыя «СПИД: опасно не знать».*

*ЦРБ, 28 чал.*

***1 снежня***

*Бібліятэкар расказала пра вірус імунадэфіцыту чалавека на інфармацыйна-пазнавальнай гутарцы «Осторожно СПИД!». Увазе наведвальнікаў прадстаўлена выстава «СПИД неизлечим, но предупредить болезнь можно».*

*Батчынская ПБ, 25 чал.*

***7 снежня***

*Бібліятэкары рассказалі аб мерах прафілактыкі і папярэджання захворвання падчас правядзення гадзіны пытанняў і адказаў «Будущее без СПИДа». Адбылася выстава плакатаў «ВИЧ/СПИД: знать, чтобы не допустить» і кніжная выстава «Наша жизнь - в наших руках».*

*Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 16 чал.*

## Мерапрыемствы да Дня правоў чалавека

***1 снежня***

*У рамках сумеснага праекта ПЦПІ бібліятэкі і натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна «Бібліятэка і натарыят: узаемавыгаднае супрацоўніцтва» **натарыус Ірына Пятроўна Марчук** правяла бясплатнае індывідуальнае юрыдычнае кансультаванне грамадзян па розных пытаннях.*

*ЦРБ, 36 чал.*

***6 снежня***

*Да 75-й гадавіны з дня прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў ПЦПІ раённай бібліятэкі арганізавана прэзентацыя выставы-панарамы «Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека – 75».*

*ПЦПІ ЦРБ*

***6 снежня***

*Заг. юрыдычнай кансультацыяй Кобрынскага раёна Брэсцкай абласной калегіі адвакатаў **Алена Мінгазава** прыняла ўдзел у інфармацыйна-гульнявой гадзіне «Галерэя правоў». Грамату пераможцаў ад ПЦПІ кобрынскай*

*бібліятэкі атрымала каманда навучэнцаў 10-А класа гімназіі, а самым актыўным удзельнікам каманд ўручаны прызы.*

*ЦРБ, 36 чал.*

## Мерапрыемствы да Года міру і стварэння

***13 снежня***

*У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбыўся раённы этап рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», арганізаваны Кобрынскай раённай арганізацыяй Грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Пераможцамі раённага этапа праекта сталі: Гольцман Анастасія і Арывановіч Марына, навучэнцы ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Кобрына» за праект «Даследаванне кіслотна-асноўных уласцівасцей прыродных індыкатараў, атрыманых з чырвоных пялёсткаў герані і ружы». Клімовіч Эдуард З ДУА «Дзівінская СШ» атрымаў перамогу з праектам «VolunTech - Прыкладанне для валанцёраў». Усе ўдзельнікі конкурсу атрымалі сертыфікаты і памятныя прызы.*

*ЦРБ, 27 чал.*

***14 снежня***

*З дапамогай* ***сурдаперакладчыка Святланы Барысюк*** *для навучэнцаў Кобрынскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната бібліятэкары правялі патрыятычную гадзіну «Ганаруся, што беларусам завуся» . Завяршылася мерапрыемства праглядам відэароліка «Мне выпала шчасце тут нарадзіцца».*

*ЦРБ, 19 чал.*

***14 снежня***

*Адбылася гадзіна патрыятызму «У времени есть своя память». Мерапрыемства суправаджалася электроннай прэзентацыяй «Хатынь».*

*Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 47 чал.*

***15 снежня***

*Міжрэгіянальны турнір па СКАНВАРДЫНГУ сярод падапечных тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Брэсцкай вобласці праводзіцца ў рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце – 2023» і мерапрыемстваў прымеркаваных да Года міру і стварэння.*

*Пераможцамі турніру сталі:*

*1 месца - Брыч Сяргей Георгіевіч, падапечны Драгічынскага ТЦСАН;*

*2 месца - Каткова Вольга Анатольеўна з Бярозаўскага ТЦСАН;*

*3 месца - Мікіціч Таццяна Мікалаеўна, Бярозаўскі ТЦСАН.*

*Удзельнікі, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджаны дыпломамі і памятнымі прызамі, прадстаўленымі ДУ «Кобрынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».*

*ЦРБ, 26 чал.*

***21 снежня***

*Ганаровымі гасцямі і экспертамі круглага сталу «Исторический путь Советской Белоруссии» выступілі:* ***Мароз Іван Паўлавіч*** *- ганаровы грамадзянін г. Кобрына,* ***Чырун Аляксандр Леанідавіч*** *- навуковы супрацоўнік Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея ім. А. В. Суворава. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Становление и развитие белорусской государственности».*

*ЦРБ, 35 чал.*

## Іншыя мерапрыемствы

***18 снежня***

*Снежаньскае пасяджэнне літаратурнага клуба "ПаэтыКо" пад кіраўніцтвам члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталлі Кандрашук прайшло ў фармаце літаратурнага рынга "Жадаю Вам…".*

*ЦРБ, 16 чал.*

## Выдавецкая дзейнасць

*Бібліёграфы цэнтральнай раённай бібліятэкі прапануюць азнаёміцца з буклетам* ***«Новации в Трудовом кодексе. Актуальная информация»****, распрацаваным у рамках ПЦПІ.*

*Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтаваны паўнатэкставы краязнаўчы інфармацыйны* ***рэсурс «Фабрыка цацак СТАА "ВП ПАЛЕССЕ"»****.*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81